**ХАПУ́Н**, міфічная істота, якою страшылі маленькіх дзяцей. Яго ўяўлялі невялічкім скурчаным дзядком з доўгай сівой барадою і з вялікай, большай за

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



*Хапун.*

яго самога, торбаю. Х. лётае па ветры, выглядаючы капрызных дзяцей, што не слухаюцца старэйшых. Падпільнаваўшы, калі такое дзіця адышлося далей ад дому, ён хапае яго і саджае ў сваю торбу. Дзяцінага плачу з завязанай торбы ніхто не пачуе: ад Х. ўжо і след прастыне, бо носіцца ён вельмі хутка. Убачыць Х. папярэдне, каб схавацца і ўцячы ад яго, немагчыма, бо ён нябачны і відзён толькі тады, калі развяжа торбу, а робіць ён гэта толькі ў сябе дома. Жыве Х. за цёмным лесам пасярод балота ў нары пад карчом. Туды ён носіць непаслухмяных дзяцей, усяляк здзекуецца з іх, нават б'е крапівою. Ніякі чалавек ніколі не даходзіў да хапуновага жытла, і ніякаму дзіцяці не ўдавалася ўцячы ад Х. Калі тыя дзеці (і хлопчыкі, і дзяўчынкі) вырастаюць, яны таксама робяцца Х., і ў іх вырастае сівая барада па калена. Пра Х. згадвалі на Вілейшчыне.

*Літ.*: Беларускія прыкметы і павер'і. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999. С. 581—582.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ